# Да 80-гадовага юбілею аўтарытэтнага бібліятэказнаўца, кандыдата педагагічных навук, прафесара Ліліі Адамаўны Дзямешка



Бягуць імклівa год за годам…
Ды ў свой чарговы юбілей
Ты не чакай узнагароды:
Ты – узнагарода для людзей.
Ты – для ўсіх нас узнагарода,
Для люду блізкага ўсяго
І для ўсяго свайго народа,
Бо верная дачка яго.

*Л.А. Дзямешка. Роднаснай душы*

Высокі прафесіяналізм, шырокая эрудыцыя і актыўная жыццёвая пазіцыя Ліліі Адамаўны Дзямешка выклікаюць заслужаную павагу і з'яўляюцца прыкладам для ўсіх, хто працаваў з ёй доўгія гады, і ўсіх, хто яе ведае. Яна – вядомы вучоны, бібліятэказнаўца – прайшла шлях ад выкладчыка да прафесара і заслужыла павагу і аўтарытэт не толькі сярод айчыннай бібліятэчнай супольнасці, але і шырока за яе межамі.

Лілія Адамаўна нарадзілася 30 сакавіка 1938 г. у вёсцы Замагілле Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Пасля заканчэння Уздзенскай сярэдняй школы і правучыўшыся год у Смілавіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме, паступіла на бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага, які скончыла ў 1961 г. Працавала інспектарам па бібліятэчнай рабоце ў Мінскім абласным упраўленні культуры, метадыстам у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна, галоўным бібліятэкарам у навукова-метадычным аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

У 1972 г., набыўшы пэўны практычны вопыт падчас 12-гадовага стажу бібліятэчнай работы, паступіла ў аспірантуру пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М. Горкага. Пасля заканчэння аспірантуры, з 1976 г. працавала выкладчыкам на бібліятэчным факультэце (цяпер факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый) Мінскага інстытута культуры (Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў). У 1979 г. паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю і атрымала вучоную ступень кандыдата педагагічных навук, а ў 1984 г. – вучонае званне дацэнта. З 1994 г. працавала на пасадзе прафесара кафедры бібліятэказнаўства (цяпер кафедра бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці).

Цяжка пераацаніць асабісты ўнёсак Ліліі Адамаўны як навукоўца, эксперта і аналітыка, аўтара каля 400 навуковых работ у беларускім і замежным друку, вучэбных і навукова-практычных дапаможнікаў па пытаннях сутнасці бібліятэчнай прафесіі, сацыяльнай ролі бібліятэкі ў грамадстве, кнігі і чытання ў розных этнічных групах, выхавання і адукацыі карыстальнікаў бібліятэк, інавацыйных і традыцыйных тэхналогій у выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і доступу да іх, рэкламавання бібліятэчнай прадукцыі, бібліятэчнай тэрміналогіі.

На працягу 36 гадоў Л.А. Дзямешка ажыццяўляла выкладчыцкую дзейнасць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і на працягу 25 гадоў з'яўлялася кіраўніком навукова-даследчай работы кафедры. За гэты час яна распрацавала кірункі і методыку пяці буйных кафедральных комплексных даследаванняў.

Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле Ліліі Адамаўны было праведзена даследаванне стану чытання польскай кнігі ў Беларусі і беларускай – у Польшчы, вынікам чаго сталі арганізаваныя Беларускім універсітэтам культуры і Варшаўскім універсітэтам міжнародныя канферэнцыі.

Яшчэ адзін напрамак яе даследаванняў – тэрміналогія ў галіне бібліятэчнай справы, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства. У суаўтарстве з прафесарам В.Е. Лявончыкавым і намеснікам дэкана факультэта дадатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Р.І. Саматыя ўпершыню ў Беларусі распрацаваны і выдадзены «Руска-беларускі слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў».

Лілія Адамаўна ўдала спалучае навукова-педагагічную дзейнасць з творчай. Яна паэтэса. Вершы яе – лірычныя, прасягнутыя любоўю да маці, да роднай зямлі, беларускай мовы, да сяброў і калег – публікуюцца на старонках перыядычнага друку, змяшчаліся ў зборніку «Мелодыі» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (1996), а пасля – у выпусках творчай суполкі ўніверсітэта «Букет». У 2012 г. выйшаў з друку зборнік яе вершаў «Мне жыццё ўяўляецца полем».

Унёсак Л.А. Дзямешка ў развіццё бібліятэчнай справы краіны з'яўляецца несумненнай каштоўнасцю не толькі для сённяшняга, але і для наступных пакаленняў бібліятэкараў, садзейнічае фарміраванню і развіццю інфармацыйнага грамадства, яго духоўнаму росту, за што яна неаднаразова атрымлівала дзяржаўныя ўзнагароды.

Ліліі Адамаўне Дзямешка ад калектыву Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, рэдакцыйнай калегіі часопіса «Бібліятэчны свет», навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і ўсёй бібліятэчнай супольнасці – самыя шчырыя віншаванні з юбілеем і пажаданні моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі і сіл, творчага натхнення, шчасця і дабрабыту!